*Актуальная тэма*

# СЕМАНТЫКА-ФУНКЦЫЯНАЛЬНЫЯ ТЫПЫ НАМІНАТЫЎНЫХ СКАЗАЎ

У залежнасці ад семантыка-граматычнай функцыі намінатыўныя сказы падзяляюцца на апісальныя (быційныя, экзістэнцыяльныя) і ўказальныя.

*Апісальныя намінатыўныя сказы* шырока ўжываюцца ў розных стылях мовы. Ім уласціва вобразнасць і лаканічнасць, аднак выкарыстанне іх пісьменнікам залежыць ад аўтарскай манеры. Спецыфіка намінатыўных сказаў вызначае жанры, дзе яны найбольш пашыраныя і амаль неабходныя. Гэта літаратурныя сцэнарыі, драматургічныя творы (з намінатыўнымі сказамі-рэмаркамі), дзённікавыя і падарожныя запісы, якія патрабуюць кароткага, сціслага і адначасова поўнага адлюстравання падзей. Асноўная функцыя апісальных намінатыўных сказаў – паведамленне пра наяўнасць у рэчаіснасці прадметаў, з'яў, падзей, якая, аднак, можа праяўляцца вельмі своеасабліва, у сувязі з чым сярод апісальных намінатыўных сказаў выразна вылучаюцца тры разнавіднасці: ***уласна апісальныя*** *намінатыўныя сказы*, ***ацэначна-быційныя*** *і намінатыўныя* ***сказы-паведамленні***.

Характэрная асаблівасць ***уласна апісальных*** сказаў – ярка выражанае, нічым не ўскладненае значэнне быцця, існавання прадметаў, з'яў, падзей. Асноўная функцыя вызначае сферу ўжывання ўласна апісальных сказаў: празаічныя і паэтычныя творы (мастацкія апісанні), мова публіцыстычных артыкулаў, а ў мове афіцыйных дакументаў яны выкарыстоўваюцца рэдка. Прадуктыўныя такія сказы ў мове аўтара і толькі з пэўнай стылістычнай нагрузкай прысутнічаюць у мове персанажаў.

У залежнасці ад семантыкі галоўнага члена сярод уласна апісальных сказаў вылучаюцца:

• сказы-апісанні месца дзеяння. Галоўны член такіх сказаў – пераважна ўласная назва. Яны часцей за ўсё пачынаюць апавяданне (стаяць у пачатку абзаца, твора) і сустракаюцца ў дзённіках, нарысах, кароткіх нататках: ***Іран.*** *Красавік. Даўно я не еў беларускага хлеба, ад паху смалістага бору адвык* (П. Панчанка). ***Свіцязь.*** *Аслоненае дубамі возера, якое праз адну душу ўлілося ў вялікую паэзію* (Я. Брыль). Галоўны член такіх уласна апісальных сказаў можа быць выражаны агульным назоўнікам. Пастаўленыя ў пачатку апісання, гэтыя сказы ствараюць цэлую карціну, што паўстае перад чытачом у непасрэднай блізкасці, або малююць фон, на якім адбываецца дзеянне: ***Зарэчны бор.*** *Паміж хвайні гатовы дзве зямлянкі. Дзятлы ў зялёнай гушчыні дзяўбуць бесперастанку* (М. Лужанін). ***Лес.*** *Закінуты провад антэны высока на хвою* (А. Куляшоў);

• сказы, якія абазначаюць час дзеяння. Звычайна пачынаюць апісанне і называюць частку сутак, дні тыдня, месяца, пару года; пашыраныя ў мове нататак, дзённікаў, публіцыстычных артыкулаў: ***Нядзеля.*** *Першы дзень, калі на верандзе сядзець ужо холадна* (Я. Колас). ***Восень сорак другога года. Цёмная мокрая ноч.*** *А мужчыны стаяць на загуменні і глядзяць, як… гарыць, дагарае падпаленая вёска* (Я. Брыль). ***Ноч. Дванаццатая гадзіна.*** *Паўшар'е парывала воссю сухой* (Р. Барадулін). Такія ўласна апісальныя сказы з'яўляюцца сродкам стварэння пейзажных малюнкаў, яны актыўныя ў паэзіі: ***Зіма.*** *І золкія завеі… Дарогі снегам замяло. Таполі ў наквеці сівеюць, – і нікнуць бомы за сялом* (Я. Колас). ***Вясна.*** *Сонца ўзыходзе, свеціць на зямлі* (Я. Купала). Малюнкі становяцца асабліва выразнымі, вобразнымі, калі галоўны член уласна апісальных намінатыўных сказаў развіты азначэннямі-эпітэтамі, якія надаюць апавяданню эмацыянальна-экспрэсіўную афарбоўку: ***Панурая поўнач. Халоднае мора,*** *дзе бура выводзіць акорды глухія, дзе голага лёду пачварныя горы вартуюць сакрэты і тайны стыхіі* (Я. Колас). ***Неабдымнай далечы сінеча. І бяздонне, неабсяжнасць мар*** (Г. Міклашэвіч);

• сказы, якія абазначаюць працэсы працы, што адбываюцца ў пэўны каляндарны перыяд. Галоўны член такіх намінатыўных сказаў – аддзеяслоўны назоўнік са значэннем працэсу дзеяння: ***Жніво.*** *Галіны рукі гудуць ад стомы* (Я. Брыль). ***Касьба!*** *Ці ёсць весялей работа; адбіць касу, намянташыць, потым прайсці пракос і назад вярнуцца, напіцца квасу і размахнуцца* (М. Лужанін);

• сказы, што абазначаюць з'явы прыроды, перадаюць агульны стан асяроддзя. Галоўны член такіх сказаў – назоўнік з адцягненым значэннем: ***Туман.*** *Раса шукае выйсця – стрывожаная вецярком, з пажоўклых жылкаватых лісцяў, нібы з далоняў, лье цурком* (П. Панчанка). *Апала раса.* ***Гарачыня.*** *Хмаркі, як пух лебядзіны* (Я. Колас);

• сказы, што абазначаюць фізічны і маральны стан чалавека: *Марылька гэтакая была*

Рэпазіторый БНТУ

*жыццярадасная, гэтакая вясёлая.* ***Маладосць!*** (К. Чорны). ***Старасць.*** *Сіл няма* (М. Зарэцкі). ***Сум.*** *Якое дзікае страшнае месца* (А. Чарнышэвіч);

• сказы, у якіх канстатуецца наяўнасць у рэчаіснасці прадметаў. Галоўныя члены такіх сказаў – адушаўлёныя ці неадушаўлёныя назоўнікі. Ужываюцца гэтыя сказы і па адным, і цэлымі ланцужкамі, што залежыць ад канкрэтнага праяўлення іх апісальнай функцыі: ***Зося Савіч!*** *Шыковіч бачыць яе ўпершыню* (І. Шамякін). ***Стол.*** *За сталом чалавек* (М. Лужанін). ***Коні... Коні...*** *Чую тупат, часам зброя бразне, часам цуглі* (А. Зарыцкі);

• сказы, у якіх называюцца грамадскія з'явы, падзеі: ***Кірмаш.*** *Размова шчырая з тым, з гэтым пачынаецца* (А. Куляшоў). ***Вайна...*** *Адзінокія фабрыкі тужаць* (П. Глебка).

Уласна апісальныя сказы могуць выконваць абагульняльную функцыю. Яны пачынаюць апісанне; далей у тэксце раскрываецца, удакладняецца, канкрэтызуецца агульны малюнак, акрэслены намінатыўнымі сказамі: ***Варшаўскі нацыянальны музей.*** *Гістарычныя палотны Матэйкі, якія хочацца назваць магутнымі: "Грунвальд", "Рэйтан", "Канстытуцыя 3 мая", "Пропаведзь Скаргі"...Поўныя сонца і любасці простага чалавека карціны Халмоньскага: "Буслы прыляцелі", "Бабіна лета"...* (Я. Брыль).

Пры стварэнні пейзажнага малюнка ці пры апісанні падзей, з'яў, прадметаў пісьменнік нярэдка выкарыстоўвае ўласна апісальныя сказы і як абагульняльныя, і як сказы, якія дэталізуюць, канкрэтызуюць змест абагульняльных. Гэта дае магчымасць не толькі стварыць поўны мастацкі вобраз, але і рэльефна вылучыць на першы план яго асобныя дэталі, што робіць апісанне жывым і непасрэдным: ***Раскошны манастырскі парк, хутчэй – батанічны сад. Кіпарысы. Кветкі.*** *Лебедзі на сажалках.* ***Канал,*** *доўгі, серабрысты меч якога, распароўшы густую зеляніну сада, упіраецца ў мора.* ***Старадаўні, велічна просты, строгі касцёл Святога Духа*** (Я. Брыль). ***Бацькаўшчына, бацькаўшчына... І хаціна родная, і вуліца, і сцяжынка, змалку пратаптаная...*** (К. Кірэенка).

Абагульняльныя намінатыўныя сказы часам так цесна зліваюцца з далейшым апісаннем, што змест гэтага апісання ўспрымаецца як заканамерны вынік падзей ці з'яў, якія канстатуюць абагульняльныя сказы: ***Гром! Дажджын адгалоскі!*** *Буйны постук па свежай раллі.* ***Клейкі ліст для бярозкі. Веснавое пітво для зямлі. Гром!*** *Усходы на гонях. Жыватворная завязь садам* (К. Кірэенка). ***Зіма. І снежныя сумёты, палі, снягі і зноў палі*** (М. Хведаровіч).

Уласна апісальныя намінатыўныя сказы могуць падагульняць, заключаць апісанне. Яны цесна звязаны з кантэкстам, што збліжае іх з няпоўнымі двухсастаўнымі: *Пачаліся асабнякі ў садках, у бярозах. Вузкія тратуары, крапіва ля платоў.* ***Ускраіна*** (П. Пестрак).

Заключальныя намінатыўныя сказы шырока выкарыстоўваюцца ў мастацкіх замалёўках. Пісьменнік спачатку падае асобныя дэталі малюнка, а ў канцы апісання перад чытачом паўстае мастацкае палатно, назву якому дае заключальны апісальны намінатыўны сказ: *Прыйшоў пагодлівы канец сакавіка, пачатак новай вясны, што заўсёды так моцна хвалюе. Вераб'іны кірмаш у кучы бярозавага вецця пад плотам. Гуллівая песня шпака каля новай шпакоўні. Звоняць жаўранкі, звоніць вада ў ручаінах. На вёсцы цэлы дзень пераклікаюцца вербалозавыя свісцёлкі, якімі ў гэты час узброены кожны хлапчук...* ***Вясна!*** (Я. Брыль). *Скрозь стагі, стагі ў зялёных світах... Звезлі з поля залатое жыта, а бярозы, клёны, дзе ні глянеш, – апранулі жоўтае ўбранне. Быццам сарамлівая дзяўчына, аж гарыць ад чырвані рабіна, вецер золкі на шляхах гуляе, дзе ні йдзе, чырвонцы растрасае, павукі паміж ялін і сосен колькі заснавалі новых кросен.* ***Восень... Восень...*** (П. Броўка).

Часам у функцыі абагульнення ўжываецца ўласна апісальны сказ, які пачынае апісанне, пасля ідуць ланцужкі намінатыўных сказаў, якія перадаюць асобныя дэталі агульнага малюнка, двухсастаўныя сказы, а ў заключэнні – ацэначна-прэдыкатыўны сказ, які дае аўтарскую ацэнку апісанню. Такім спалучэннем розных тыпаў сказаў з адной і той самай функцыяй пісьменнік дасягае вобразнасці малюнка, яго завершанасці: ***Дарога Ратэрдам – Амстэрдам. Раўніна.*** *Багаты лес: дубы, вязы, платаны, клёны... Парнікі і адкрытыя грады. Прыгожыя домікі, ветракі, касцёлы, зноў ветракі. Вада не ўмяшчаецца ў незлічоных канавах, blішчыць нават на раллі. Раскошная аўтастрада* (Я. Брыль). ***Торунь.*** *Шырокая велічна-спакойная Вісла. Прыгожыя масты. Зеляніна. Чырвоныя дахі, вузкія вуліцы, суровая готыка касцёлаў. Вайна абмінула двойчы – у дні разгрому і ў дні вызвалення – гэты стары ўтульны горад. Горад Каперніка, горад заводаў і школ і адначасна горад мяшчанства* (Я. Брыль).

Уласна апісальныя сказы выконваюць функцыю ўдакладнення, канкрэтызацыі прадметаў, з'яў, пра якія паведамляецца ў кантэксце: *Неўзабаве яны выбіліся на шырокае балота.* ***Дробныя хвойкі, куп'ё, лазнякі, ды чараты, чараты*** (М. Лынькоў).

З функцыяй удакладнення, канкрэтызацыі пісьменнікі выкарыстоўваюць апісальныя ска-

Репозиторий БНТУ

зы пры абмалёўцы знешняга вобліку героя, пры партрэтнай характарыстыцы. Спачатку аўтар называе свайго героя, а пасля пералічвае яго рысы: *Рысы ў хлопца былі няправільныя, але буйныя і нават у чымсьці гожыя.* ***Цяжкаватае падбароддзе, вялікі цвёрды рот. Жасткаваты няправільны нос*** (У. Караткевіч). *У цэнтры іх – герой, вялікі лётчык. На цвёрдых вуснах – неастылы смех.* ***Высокі лоб. Брывей круты разбег. І смелыя дапытлівыя вочы...*** (П. Панчанка).

*Заўвага.* Уласна апісальныя намінатыўныя сказы могуць канкрэтызаваць, удакладняць абагульняльныя словы. Іх трэба адрозніваць ад сказаў з аднароднымі членамі. Аднародныя члены амаль заўсёды стаяць за абагульняльнымі словамі ці перад імі, яны сэнсава і сінтаксічна звязаны паміж сабой. Удакладняльныя намінатыўныя сказы нярэдка бываюць аддзелены ад абагульняльных слоў іншымі сказамі. Сувязь паміж імі толькі сэнсавая і значна слабейшая, чым у сказах з аднароднымі членамі; намінатыўныя сказы часта адносяцца не толькі да абагульняльных слоў, але і да ўсяго зместу апісання. Параўнайце: ***Дняпро... Ака... Раздольнай Волгі плынь, Уральскіх гор гранітная града, сузор'е прыангарскіх гарадоў...*** *Ты ўся цяпер, уся перада мной, мая Радзіма* (А. Зарыцкі). *Вудачкі, вуды, начныя шнуры, венцер, восці, сачок – уся гэта рыбацкая снасць пушчалася ў ход* (Я. Брыль). Названыя канструкцыі выразна адрозніваюцца. У першым прыкладзе відавочная самастойнасць намінатыўных сказаў, сэнсава звязаных з наступным кантэкстам. У другім прыкладзе – адзін сказ, у якім абагульняльнае слова і аднародныя члены звязаны і сінтаксічна, і сэнсава.

Уласна апісальныя намінатыўныя сказы выкарыстоўваюцца і як адзіночныя, і групамі – намінатывамі-ланцужкамі, каб перадаць:

• паслядоўнае развіццё падзей (або назваць асобныя дэталі, узятыя з агульнага малюнка і пададзеныя ў пэўным парадку): ***Асаднікі хутар, фальварак нейкі, шэрая вёска. Гай.*** *І быццам сон на павекі, спускаецца ўніз небакрай* (А. Зарыцкі);

• фізічны і псіхічны стан чалавека. У хвіліны нервовай узбуджанасці, моцнага хвалявання ў свядомасці чалавека фіксуюцца асобныя дэталі наваколля, якія часам усплываюць адна за адной без усялякай сувязі: ***Ноч.*** *Летуценням шырокі прастор.* ***Праявы жаданай сустрэчы. Штаб. Пакет. Рыгорка. Аўзор...*** *Поруч таварыш у фрэнчы* (А. Александровіч);

• суцэльны пейзажны малюнак з выдзяленнем асобных яго дэталей: ***Кучматы лес, утульны луг і поле...*** *Гляджу, што дзеецца ў блакітным доле* (Я. Колас). ***Майская зеляніна прысадаў і збожжа. Вёска. Чыгуначны пераезд з паласатым, як быццам спрадвеку задзёртым шлагбаумам.*** *Зноў толькі поле за прысадамі.* ***І сонца.*** *І жаўранкі – недзе з-пад самага сонца* (Я. Брыль);

• стан навакольнага асяроддзя, які нярэдка сугучны з настроем героя або самога аўтара. Такія сказы пашыраныя ў паэзіі: ***Завіруха... Зіма... Адпачынак...*** *Пераклікнуцца першыя пеўні* (П. Трус). ***Спякота. Лівень. Сіні гром.*** *Раскрыла лета ўсе вароты, і хоча кожны жаўтароты дастаць да гэтых дзіў крылом* (А. Пысін);

• замалёўкі, якія ўзнікаюць у памяці чалавека. Нярэдка аўтар спецыяльна падкрэслівае, што гэта вобразы-ўспаміны, вобразы-фантазіі: *Маленства маё, ты далёка, далёка!* ***Школьныя парты. Глобус. Карты*** (П. Панчанка). *А калісьці і я прачынаўся ў бацькавай хаце.* ***Чэрвень. Раніца. Росы і цішыня.*** *На гародзе спявае паціху маці пра жаўнера маладога, пра гнядога каня* (П. Панчанка).

У беларускай літаратурнай мове шырока распаўсюджаны намінатыўныя адзіночныя сказы. Функцыя іх даволі разнастайная:

• перадаюць асобны этап у развіцці падзей: *Скончыўшы толькі што бітву з пажарам лясным, шляхам ішлі камсамольцы ў калоне паходнай...* ***Першы прывал.*** *Стагадовыя сосны, яліны шумам віталі іх на скрыжаванні дарог* (А. Куляшоў). *Трывожная ціш ляжала на ўсім працягу лініі акопаў. Зараз будзе атака!* ***Дванаццаць гадзін...*** (Э. Самуйлёнак);

• заключаюць, падагульняюць апісанне. Такія сказы звычайна абазначаюць стан прыроды ці чалавека пасля нейкіх падзей, хвалявання, псіхічнага напружання: *Леглі сябры ва ўсім паходным. Гарматы сціхлі.* ***Цішыня*** (А. Пысін). *Халадком патыхае вячэрнім... Сонна ціўкае шпачаня... Брэст 22 чэрвеня.* ***Цішыня*** (Р. Барадулін);

• канкрэтызуюць апісанне, называюць асобныя дэталі яго, вылучаючы на першы план істотнае: *І тут другая лістоўка.* ***Чырвоная яркая папера.*** *Яшчэ больш яркія словы* (М. Лынькоў). *Над Відзамі страляе ў неба готыка касцёла.* ***Чырвоная цэгла, шэры бляшаны дах*** (Я. Брыль).

Уласна апісальныя намінатыўныя сказы выкарыстоўваюцца як рэмаркі. Яны сустракаюцца ў паэзіі і прозе, дзе звычайна пачынаюць апісанне – стаяць у пачатку абзаца, страфы, раздзела: ***Халодная ясная ноч...*** *Звонка хрумчыць сняжком, ідучы мне насустрач дзяўчына* (М. Багдановіч). ***Пачатак лістапада. Вечар.*** *Лабановіч*

Репозиторий БНТУ

*сядзіць у сваім аблюбаваным пакойчыку* (Я. Колас).

Апісальныя сказы-рэмаркі пашыраныя ў драматургічных творах і літаратурных сцэнарыях, дзе выступаюць як тэхнічны сродак – перадаюць час, месца дзеяння: ***Цельшына. Восень. Вечар.*** *З цемры вырысоўваецца будынак школы,* ***хата Падлоўчага, журавель студні, старая груша*** (А. Звонак). ***Час каля Купалля. Паўдня. Хата Зяблікаў*** (Я. Купала).

Пры дапамозе ўласна апісальных намінатыўных сказаў пісьменнікі ствараюць замалёўкі, у якіх выпісана кожная дэталь. Сустракаюцца страфы ці цэлыя вершы, якія складаюцца амаль з адных намінатываў-ланцужкоў: *Лясы, лясы і пералескі, ды непралазныя кусты; лістом завеяныя сцежкі; і сініх зораў дождж густы* (П. Трус). *Бор. Сасновыя шаты. Ды верас. Ды мох. Чалавек барадаты. Цяпельца. Дымок* (А. Куляшоў). ***Цяплынь начэй і зорнасць, мядовы ліпы пах... Святая непакорнасць*** *і сорам у вачах.* ***Шчымлівасць ранку. Спеўнасць. І нараджэнне дня. Каханне. Можа, рэўнасць.*** *У сэрцы цішыня.* ***Зямнога свету вечнасць. Палёт імклівых мар. Цнатлівасць. Можа, грэшнасць. Кахання Божы дар*** (Г. Міклашэвіч).

Да апісальных намінатыўных сказаў большасць даследчыкаў адносяць блізкія і структурай, і функцыяй *ацэначна-быційныя сказы*. У такіх сказах сцвярджаецца існаванне ў рэчаіснасці прадметаў, з'яў і даецца ім ацэнка. Нярэдка значэнне ацэнкі, якаснай характарыстыкі выступае на першы план, што дае падставы некаторым лінгвістам выводзіць іх з разраду намінатыўных сказаў. Тым не менш у сказе *Якая ноч!* канстатуецца існаванне часу сутак і даецца адпаведная ацэнка-характарыстыка гэтай з'яве: якасная ацэнка ў такіх сказах граматычна афармляецца інтанацыяй у спалучэнні з наступнымі словамі:

• займеннікамі і часціцамі: ***Якія горы!*** *А сады якія! Тут шмат зямнога цёплага дабра* (П. Панчанка). ***"Што за дзяўчына! Што за натура!"*** *– колькі разоў паўтараў малады, шчаслівы настаўнік* (Я. Колас). ***Ну і сонца!*** *Разарваўшы морак шызы, затапіла свет шырокі, і ва ўсе двары і шыбы промняў хлынулі патокі* (П. Глебка). ***Ну зіма! Ну пагодка!..*** *Сёння, калі па звычаю прайсціся пасля абеду, дык хіба толькі па вуліцы пасёлка, у сякім-такім зацішку* (Я. Брыль);

• якаснымі прыметнікамі. Гэтыя сказы даволі цесна звязаны з сітуацыяй, галоўны член іх – назоўнік з адцягненым значэннем – канкрэтызуецца ў кантэксце, якому яны надаюць экспрэсіўную і абагульнена-лагічную характарыстыку: ***Цудоўныя, шчаслівыя хвіліны.*** *Час адзіноты, роздуму і песенна-бяздумнага маўчання...* (Я. Брыль). *У шэсць гадзін раніцы пачалася артылерыйская падрыхтоўка. У цемры раптам шуганулі ўгору маланкі, разлёгся гром. Адразу загаварылі сотні гармат... Святло трапятала на дрэвах, на тварах байцоў, на танкавых вежах.* ***Незабыўнае, вялікае відовішча!*** (І. Мележ);

• часціцамі, займеннікамі і прыметнікамі адначасова: ***Ах, якое дружнае, якое высокае жыта!*** *Поўныя тугія каласы важка пагойдваюцца пад гарачымі павевамі ветру...* (І. Мележ). ***Які незвычайны дзень!*** *Адзін дзень у жыцці. Леапольд Гушка бачыў перад сабою берагі шчаслівай зямлі* (К. Чорны).

У сучаснай лінгвістычнай літаратуры замацавалася кваліфікацыя гэтых сказаў як ацэначна-быційных аднасастаўных.

*Намінатыўныя сказы-паведамленні* маюць сваю спецыфіку. Асноўная сутнасць гэтых сказаў: аўтар імкнецца перадаць думку пра існаванне прадмета, з'явы, падзеі ярка і падкрэслена, што дасягаецца пры дапамозе адпаведнай эмацыянальна-экспрэсіўнай інтанацыі. У большасці выпадкаў гэта сказы з павышанай эмацыянальнасцю, з клічнай інтанацыяй. Але не кожны апісальны сказ – сказ-паведамленне. Параўнаем: 1. ***"Пажар!"*** *– загаманіла варта* (Я. Колас). 2. ***"Вясна!"*** *– у Бардзюковым голасе і радасць, і здзіўленне, і недаўменне гучыць* (Б. Мікуліч). 3. ***Пажар! Пажар! Пажар!*** *Гарыць усё старое, шчэ на чырвоным жары ўзрастае маладое* (В. Таўлай). 4. ***Вясна!*** *У яркай квецені палеткі і сады. Пялёсткамі замецены былыя халады* (А. Астрэйка). З чатырох вылучаных сказаў першыя два – сказы-паведамленні, два другія – уласна апісальныя.

У афармленні сказаў-паведамленняў першаступенная роля адводзіцца інтанацыі: суразмоўца не проста паведамляе пра існаванне прадмета (з'явы), але і патрабуе пэўнай рэакцыі на той ці іншы факт. Сказы-паведамленні характарызуюцца канкрэтнасцю пры выражэнні думкі, паведамляюць пра факты, прадметы ці з'явы, якія існуюць непасрэдна ў момант гутаркі ў адпаведных абставінах. Яны вызначаюцца лаканізмам: гэта, як правіла, простыя неразвітыя сказы, у склад якіх часам уваходзяць звароткі ці дзеясловы загаднага ладу: *Хтось з аравы закрычаў з перапалоху:* ***"Глянь, міліцыя! Аблава!"*** (А. Александровіч). ***"Вайна, Саша"****, – Марыя Сяргееўна азірнулася: у палаце нікога не было* (І. Шамякін).

**Ніна ГАЎРОШ,**
кандыдат філалагічных навук.
**Ірына САВІЦКАЯ,**
кандыдат філалагічных навук.



Рэпазіторый БНТУ